*І.Л. БУРАК*

# ФУНКЦЫІ ЗЛУЧНІКАЎ У МАСТАЦКІМ ТЭКСЦЕ

Для злучальных злучнікаў у сучаснай беларускай мове ўласцівы як агульныя, так і прыватныя функцыі. Агульнай двуадзінай функцыяй з’яўляецца забеспячэнне сувязі і паказчыка адносін паміж рознымі сінтаксічнымі адзінкамі.

Злучнікавая сувязь і пароджаныя ёю адносіны могуць рэалізавацца па-рознаму, у адпаведнасці з чым выдзяляецца некалькі прыватных функцый гэтых злучнікаў. Самай істотнай з’яўляецца канструктыўная функцыя, сутнасць якой складае ўласцівасць злучнікаў аб’ядноўваць кампаненты рознага характару, рознага ўзроўню і рознай ступені складанасці, уласцівасць утвараць з адных адзінак другія. З канструктыўнай цесна звязана тэкстаўтваральная функцыя, якая рэалізуецца ў тых выпадках, калі злучнікі аб’ядноўваюць самастойныя сказы або іх аналагі ў тэксце. Забяспечваючы цэласнасць і звязнасць паасобных адзінак на працягу ўсяго тэксту, злучнікі завастраюць увагу на “паслядоўным, значным развіцці ўнутрытэкставага зместу, служаць раскрыццю сэнсавай структуры тэксту”.

Некаторыя злучальныя злучнікі зрэдку могуць выконваць уставачна-каменціравальную і пачынальна-афектыўную функцыі. Уставачна-каменціравальная функцыя рэалізуецца пры ўключэнні ў сказ устаўных канструкцый, якія звязаны з ім па сэнсу і каменціруюць яго змест. Пачынальна-афектыўную функцыю злучнікі выконваюць тады, калі яны размяшчаюцца ў пачатку самастойных сказаў, якіх няма да чаго далучаць у тэксце. Характар такіх канструкцый сведчыць аб тым, што ў даным выпадку злучнікі выконваюць не столькі сваю ўласную функцыю, колькі функцыю адпаведных часціц.

Акрамя таго, злучальныя злучнікі могуць выконваць камунікатыўную і эмацыянальна-экспрэсіўную функцыі, паколькі з дапамогай гэтых злучнікаў устанаўліваюцца розныя сэнсавыя і эмацыянальна-экспрэсіўныя

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

сувязі паміж асобнымі кампанентамі маўленчай плыні, ажыццяўляецца лагічнае чляненне маўленчых адрэзкаў, перадаюцца і ўспрымаюцца значэнне цэлага і адносіны да яго асобных частак. Злучнікі з’яўляюцца сродкам выдзялення і акцэнтавання рэмы, павышэння эмацыянальнасці і ўзмацнення экспрэсіўнасці выказвання, рэалізаванага ў сказе. Не выпадкова злучнікавыя канструкцыі актыўна выкарыстоўваюцца ў якасці розных стылістычных фігур для адлюстравання адпаведных з’яў аб’ектыўнай рэчаіснасці.

Некаторыя стылістычныя фігуры арганізуюцца толькі з дапамогай злучнікаў. Так, напрыклад, утвараецца полісіндэтон — стылістычная фігура, заснаваная на шматразовым выкарыстанні злучнікаў (аднаго і таго ці розных): *Я люблю ўсходы нашых палеткаў, і спавітыя ў зелень лугі, і шум бору пануры, глухі, і шаптанне крыніцы ўлетку (Я.* Купала); *З маленства люблю я лясы, іх сцішаны голас і шум патаемны, і пушчы глухія, а ў іх бураломы, дзе віхры гудзелі пад гулкія громы ды слалі дажджоў абрусы* (Я. Колас); *Усё ўжо ўснула, і толькі бярозы шапталісь, толькі асіны шумелі, і толькі калоссі, у полі шырокім качаясь, зямлю цалавалі.* (М. Багдановіч). Полісіндэтон не толькі дапамагае звязаць паасобныя кампаненты ў сінтаксічнае адзінства, але і размяжоўвае іх паміж сабой, вылучае найбольш значныя з іх па сэнсу. Пры гэтым запавольваецца тэмп паэтычнай мовы, павышаецца яе экспрэсіўнасць, выказванне атрымлівае розныя эмацыянальныя адценні.

Толькі з дапамогай злучнікаў утвараецца перыяд — стылістычная фігура, якая ўяўляе сабой разгорнуты складаназалежны сказ з адной галоўнай і некалькімі даданымі часткамі: *Ці іду я вясёлай дзянінай з касой ці з сахой за сяло і не бачусь з пахілай хацінай, пакуль чую сонца цяпло, ці ў полі, працуючы ў поце, бядую над горам сваім, — дарэмна шукаю, хто шчыра б пацешыў у цярпенні цяжкім*(Я. Купала); *Ці коска зазвоніць у час касавіцы, Ці песню дзяўчо запяе, ці неба заззяе ў агнях бліскавіцы, ці вецер задзьме-зазлуе, ці гром гучнабежны пракоціцца ў хмарах, ці грукне над лесам пярун, — усё адклікаецца ў вольных абшарах, усё іх*

РЕПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*дакранаецца струн* (Я. Колас); *А як родную згадаю старану, як згадаю яе беднасць і нуду, сэрца сціснецца, і я пяяць пачну, — мо душу хоць трохі гэтым адвяду* (М. Багдановіч). Такая структура складанага сказа дазваляе разгарнуць паэтычную задуму з максімальнай вобразна-эмацыянальнай паўнатой: шматлікія дадания часткі ўсебакова асвятляюць змест галоўнай часткі. Інтанацыя пачатковых элементаў разгортваецца па лініі нарастання, а заключных— па лініі спаду ці зніжэння. Адзін такі сказ уяўляе сабой невялікі звязны тэкст, які характарызуецца закончанасцю інтанацыі і зместу паведамлення.

З дапамогай злучнікаў, асабліва ў вершаваных творах, арганізуецца зеўгма — сінтаксічны прыём, заснаваны на супастаўленні прамога і пераноснага значэння слоў: *Вочы і думы пабеглі далёка* (Я. Купала); *Ціха ўсё было на небе, зямлі і на сэрцы* (М. Багдановіч); *Вісіць над сэрцам і над сінім верасам мядовы пах жыцця і пчолаў гуд* (П. Панчанка). У выніку далёкія і лагічна неаднародныя паняцці ўспрымаюцца як аднародныя члены. Такі прыём дазваляе яскрава перадаць найтанчэйшыя асацыяцыі, якія ўзнікаюць у працэсе паведамлення.

Іншыя стылістычныя фігуры могуць арганізоўвацца як з дапамогай злучнікаў, так і бяззлучнікавым спосабам. Так утвараецца градацыя — групоўка слоў ці выразаў з нарастаннем або, наадварот, аслабленнем іх эмацыянальна-экспрэсіўнай выразнасці. Параўн.: без градацыйных злучнікаў: *Ты — наш сцяг, што нікому, нікому на свеце, нікому не дамо абсмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць* (У. Караткевіч); з градацыйнымі злучнікамі: *Няма штосьці ўмалоту, ды і што малаціць* (Я. Купала); *Поля мала, ды і тое хоць бы ў адным месцы* (Я. Колас); *Раскажу я маме, а то і бабулі...* (Я. Купала). Як паказваюць прыклады, пры выкарыстанні градацыйных злучнікаў градацыйныя адносіны праяўляюцца асабліва выразна не толькі паміж аднароднымі членамі сказа, але і паміж прэдыкатыўнымі часткамі складанага сказа. Бяззлучнікавым спосабам градацыйныя адносіны праяўляюцца, як правіла, паміж аднароднымі членамі сказа.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Парцэляваныя і далучальныя канструкцыі таксама могуць быць як злучнікавыя, так і бяззлучнікавыя. Сутнасць парцэляцыі заключаецца ў тым, што да асноўнага (стрыжнёвага) сказа падключаюцца новыя сказы або асобныя члены сказа, у выніку чаго ствараецца ўражанне паступовага, нарастаючага развіцця думкі, непасрэднасці маўлення. Парцэляваныя канструкцыі могуць звязвацца як злучальнымі, так і падпарадкавальнымі злучнікамі, паміж імі могуць выражацца самыя разнастайныя адносіны: *Аднаму маладому лёгка заблудзіцца. Ды і страшнавата* (Я. Колас); *Маладую дзявочу красу не змалюеш, не спішаш пяром. Бо хто ж летню змалюе красу, спіша хто птушын шчэбет і гром?* (Я. Купала). Пры бяззлучнікавым аб’яднанні адносіны паміж часткамі парцэляваных канструкцый выяўляюцца не так выразна: *А ён нядаўна зноў надрукаваў артыкул. Добры* (Я. Брыль); *Пасля абеду прыйшлі госці. Нечаканыя. Незапрошаныя* (І. Шамякін). Як відаць, пры парцэляцыі асаблівая ўвага канцэнтруецца на новым паведамленні, яно вылучаецца інтанацыйна і з’яўляецца больш важным па сэнсу, чым папярэдняе. У выніку парцэляцыя садзейнічае нарастанню экспрэсіі.

Пры дапучэнні да аднаго паведамлення дабаўляецца другое, дадатковае паведамленне, якое ўдакладняе ці развівае змест папярэдняга: *У вокнах ясней заблішчэлі агні, але ненадоўга* (К. Чорны); *Маці доўга думае, і ўсё пра сына* (Ц. Гартны); *Чуўся вясёлы гоман — гэта разыходзіліся з клуба студэнты* (І. Гурскі); *За ўзгоркам невялікая вёсачка. Гэта вёсачка ў руках ворага* (І. Мележ). Бяззлучнікавыя канструкцыі ў адрозненне ад злучнікавых не так дакладна вызначаюць граматычную прыроду далучальных адносін, але затое перарывісты характар далучальнай сувязі, у афармленні якой асноўная роля належыць інтанацыі, праяўляецца тут асабліва поўна[1].

Пры пабудове складаных сказаў у творах мастацкай літаратуры шырока выкарыстоўваецца сінтаксічны паралелізм: і ў адной, і ў другой прэдыкатыўнай частцы члены сказа расстаўлены ў адной паслядоўнасці і выражаны аднолькавымі формамі, што стварае ўнутраную сіметрыю. Такім

РЕПАЗІТОРЫЙ БДПУ

чынам арганізуюцца як складаназлучаныя сказы, так і складаныя бяззлучнікавыя сказы: *Ноч надыходзіць, і хмары ўстаюць* (Я. Колас); *Перад імі сушы, моры, а над імі сонца, горы* (Я. Купала); *І хістаецца асока, і шуміць высокі бор* (М. Багдановіч); *Над ракою ў спакоі зацвітала каліна; у сяле за ракою вырастала дзяўчына* (Я. Купала); *Лес туманам заснаваўся, луг расой абмыўся* (Я Колас); *У Мікіты свой характар, у Макара свой звычай* (А Русак). Спалучальныя або супастаўляльныя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі становяцца асабліва выразнымі, калі афармляюцца пры даламозе злучнікаў і, а.

Актыўна ўжываецца ў творах мастацкай літаратуры параўнанне — супастаўленне двух прадметаў, з'яў або паняццяў, у выніку якога сутнасць аднаго з іх вытлумачваецца праз сутнасць другога. Параўнанне можа афармляцца як з дапамогай злучнікаў, так і бяззлучнікавым спосабам: *Мы — маладыя, як рэвалюцыя, поўны агню, як гартоўныя домны* (П. Броўка); *Гукне вясна і, як ветрам, развее гора-нуду* (М. Багдановіч), *Барозны струнамі ляглі* (М. Танк); *З свойскіх красак-пралесак карона твая* (Я. Купала). Злучнікавы параўнальны зварот мае больш магчымасцей для перадачы розных супастаўленняў, чым бяззлучнікавае параўнанне, бо з яго дапамогай могуць супастаўляцца не толькі паняцці, выражаныя адной часцінай мовы, але і паняцці, выражаныя рознымі чаецінамі мовы.

Супастаўляцца могуць і кантрастныя або супрацьлеглыя паняцці. Такое рэзкае супастаўленне ляжыць у аснове фарміравання антытэзы, якая ў мастацкіх творах афармляецца як бяззлучнікавым спосабам, так і з дапамогай злучнікаў: *Грыміць не голас буры, а гарматны шквал* (Я. Колас); *Горка часам праца, ды хлеб ад яе салодкі* (І. Гурскі); *Не плача — смяецца шчаслівая маці* (М. Багдановіч); *Не кавыль — пшаніца ззяе ў пацерках расы* (М. Хведаровіч). Як паказваюць прыклады, злучнікі робяць супрацьпастаўленне больш выразным, дакладным, але бяззлучнікавыя канструкцыі валодаюць большай экспрэсіўнасцю.

Кароткі агляд стылістычных фігур і спосабаў іх арганізацыі паказвае, што ў мастацкіх тэкстах актыўна выкарыстоўваюцца і злучнікавыя, і

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

бяззлучнікавыя канструкцыі. Вялікія магчымасці выбару той ці іншай фігуры, звязаныя з разнастайнасцю фармальных сродкаў сувязі, рэалізуюцца ва ўмовах канкрэтнага кантэксту і вызначаюцца яго семантыка-сінтаксічнымі і функцыянальна-стылістычнымі асаблівасцямі.

*МІНСК, БДПУ*

Літаратура

1. Бурак Л І. // Далучэнне ў сучаснай беларускай мове. Мн., 1975. С. 15.

РЕПАЗІТОРЫЙ БДПУ